і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце : матэрыялы міжнар. навук. канф., Орша, 24–25 листап. 1995 г. – Мінск, 2000. – С. 168–183.

5. *Локун, В.* У пошуку маральнага ідэалу. Проза Уладзіміра Караткевіча / В. Локун // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце : матэрыялы міжнар. навук. канф., Орша, 24–25 листап. 1995 г. – Мінск, 2000. – С. 133–152.

6. *Ненадавец, А. М.* Уладзімір Караткевіч : прырода, фальклор і творца / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 423 с.

7. *Рерих, Н.* Пути благословения / Н. К. Рерих. – Минск, 1991. – С. 49–52.

8. *Сцяпанава, А.* Рысы еўрапейскага постмадэрнізму ў творах Уладзіміра Караткевіча (на матэрыяле рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні») / А. Сцяпанава // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце : матэрыялы міжнар. навук. канф., Орша, 24–25 листап. 1995 г. – Мінск, 2000. – С. 58–62.

П. Р. ІГНАТОВІЧ

## НАРОДНАЯ КУЛЬТУРА Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ КАНСТАНЦІНА І ЯЎСТАХА ТЫШКЕВІЧАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шмат адораных людзей даў беларускай зямлі старадаўні магнацкі род Тышкевічаў. Сярод іх былі людзі самага рознага занятку: дзяржаўныя і ваенныя дзеячы, знакамітыя даследчыкі, суддзі, эканамісты, архітэктары, мемуарысты, інжынеры, музыкі. Пачэснае месца сярод іх займаюць знакамітыя прадстаўнікі Лагойскай лініі роду браты Канстанцін (1806–1868) і Яўстах (1814–1873) Тышкевічы. Іх бацька Пій Феліцыянавіч Тышкевіч (1756–1858) вызначыўся рэкордам доўгажыхарства (пражыў больш ста гадоў), шмат зрабіў для эканамічнага ўмацавання свайго графства. Атрымаўшы добрае хатняе выхаванне, скончыўшы Мінскую школу, ён прысвяціў сябе гаспадарчай дзейнасці. Разам з клопатамі эканамічнага парадку ён шмат зрабіў для памнажэння культурнай спадчыны ў родным Лагойску: пісаў сямейную хроніку, папаўняў бібліятэку і мастацкую галерэю, іграў на скрыпцы і флейце, арганізоўваў камерныя і сольныя канцэрты, быў выдатным рэзчыкам па дрэву і інкрустатарам.

Маці Канстанціна і Яўстаха Аўгуста Плятар (1782–1834) паходзіла з знатнага нямецкага роду, што здаўна асеў на Падзвінні, яна была другой жонкай Пія Тышкевіча, якому нарадзіла чатырох дзяцей – трох сыноў і дачку. Яна была высокаадукаванай жанчынай, прыхільніцай навук і мастацтваў; прымала непасрэдны ўдзел у мэтанакіраваным папаўненні дамашняй бібліятэкі і музея, сабрала велізарную калекцыю дакументаў (у тым ліку ўнікальных рукапісаў), кніг, карцін, старадаўніх прадметаў, паклала пачатак ўнікальнай калекцыі прадметаў мастацтва.

Старэйшы брат Канстанцін атрымаў добрую адукацыю, вучыўся ў Полацкім іезуіцкім і Забельскім дамініканскім калегіумах. У гэтых установах былі таленавітыя выкладчыкі, цудоўныя бібліятэкі, кабінеты з рэдкімі дапаможнікамі. У 1823 г. ён паступае на юрыдычны факультэт Віленскага ўніверсітэта, пасля заканчэння ў 1828 г. едзе ў Варшаву, дзе да 1836 г. працуе ў Міністэрстве фінансаў. У 1836 г. вяртаецца ў родны Лагойск і ён плённа займаецца гаспадарчай і навуковай дзейнасцю.

Малодшы брат Яўстах (1814–1873), нягледзячы на існуючую традыцыю для людзей яго статуса звычайна працягваць вучобу ва ўніверсітэтах, ва ўніверсітэт не пайшоў. Пасля заканчэння ў 1832 г. Мінскай гімназіі ён едзе ў Пецярбург, дзе крапатліва займаецца самаадукацыяй. Малады граф цэлыя дні праводзіў за чытаннем кніг у славутай імператарскай бібліятэцы, што дало магчымасць атрымаць грунтоўныя веды па гуманітарных навуках, знайсці новыя матэрыялы па гісторыі Беларусі. З 1833 па 1835 г. ён працуе ў вельмі прэстыжнай установе – ордэнскім капітуле пры Сенаце Расійскай імперыі.

У 1835 г. пераехаў у Вільню, а потым у Харкаў, дзе працаваў у канцылярыях генерал-губернатараў. У 1840 г. – ганаровы куратар школ Барысаўскага павета. У 1844 г. знаць барысаўскага павета абрала яго сваім маршалкам. У 1848–1854 гг. Я. Тышкевіч – куратар Мінскай гімназіі.

Навуковую дзейнасць Я. Тышкевіч пачаў у 1837 г. з раскопак курганоў у наваколлі Лагойска. У гэтым жа годзе ў «Пецярбурскім штогодніку» (выдаваўся на польскай мове) з'явілася паведамленне аб гэтых раскопках. Малады даследчык пісаў, што курганы згодна народнай традыцыі лічыліся недатыкальнымі і ён павінен быў шчодра плаціць прыгонным, працаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разам з імі, каб яны згадзіліся на такі «грэх». Былі выкладзены першыя вынікі раскопак. У далейшым Я. Тышкевіч штогодна праводзіў экспедыцыі па Міншчыне, пераважна па Барысаўшчыне і, асабліва, Лагойшчыне.

Па прыкладу малодшага брата Канстанцін Тышкевіч таксама заняўся раскопкай курганоў. Паступова тэрыторыя даследаванняў расшыраецца і браты выходзяць за межы Лагойшчыны, Барысаўшчыны і нават Міншчыны. Абодва браты шмат і паспяхова працавалі над разгадкай таямніц помнікаў старажытнага краю. У выніку былі раскапаны сотні курганоў, у друку з'явіліся буйныя аналітычныя публікацыі. Дабытыя пры раскопках багатыя археалагічныя матэрыялы разам з іншымі рарытэтамі станавіліся экспанатамі будучага музея ў Лагойску, які афіцыйна быў адкрыты ў 1842 г., а потым Віленскага музея старажытнасцей.

Вынікі раскопак К. Тышкевіч падвёў у сваёй манаграфіі «Пра курганы ў Літве і Заходняй Русі». Работа спачатку друкавалася ў журнале «Віленскі веснік», а ў 1865 г. у Вільні выйшла асобнай кнігай. У ёй аўтар робіць класіфікацыю курганных насыпаў, падзяляе іх на пяць груп у залежнасці ад функцый.

Адначасова з археалагічнымі раскопкамі Я. Тышкевіч пачаў займацца і фальклорам. Духоўная культура народа ніколі не пакідала яго абыякавым, дарэчы як і старэйшага брата Канстанціна. На працягу многіх гадоў збіраліся матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, тапаніміцы, фальклору, у тым ліку пры дапамозе шматлікіх добраахвотнікаў.

Прайшло 10 гадоў нялёгкай працы, і нарэшце ў 1847 г. у Вільні ўбачыла свет кніга «Апісанне Барысаўскага павета» (па форме і сутнасці краязнаўчая манаграфія). У ёй адлюстравана гісторыя развіцця Барысава і Барысаўскага павета пачынаючы ад звестак пра яго заснаванне і да апошняга часу. Я. Тышкевіч таксама прыводзіў каштоўныя звесткі па гісторыі Лагойска і Лагойскага графства, зрабіў дасканалае апісанне замка і размешчанага ў ім музея. Затым адпраўляецца на Заходнюю Дзвіну, Нёман, знаёміцца з адпаведнымі матэрыяламі на Палессі і Пасожжы.

Я. Тышкевіч адным з першых у беларускай фалькларыстыцы і этнаграфіі на прыкладзе Барысаўскага павета даў увесь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаспадарча-гадавы каляндар селяніна. Ён падрабязна апісвае апрацоўку льну, уборку і захаванне гародніны: буракоў, капусты, бульбы, агуркоў, рэпы, бручкі, цыбулі, морквы і інш. Аўтар апісвае, што сабой уяўлялі скляпы, капцы, дзе сяляне захоўвалі бульбу, падрабязна піша пра спосабы засолкі і захавання агуркоў, ў тым ліку ў шчыльна закрытых і асмаленых бочках, якія апускаліся ў ваду і там захоўваліся да ўжывання [1].

Я. Тышкевіч адным з першых пачаў запіс легендаў, звязаных з markcознымі зёлкамі, пераважна абрадавага ці лекавага прызначэння. Ён нават стварыў рукапісны сшытак з зёлкамі Барысаўскага павета, які зараз знаходзіцца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі АН Літвы.

Дзякуючы пранікненню ў таямніцы старажытнай культуры беларусаў як матэрыяльнай, так і духоўнай, Я. Тышкевіч робіць параўнанні з адпаведнымі культурамі іх суседзяў. Гаворачы пра некаторыя супадзенні абрадаў, прыводзіць прыклад пакланення жыхароў Літвы, латышоў і бліжэйшых славян аднаму і таму ж богу Перуну, вужакам, волатам-дрэвам. У тых і другіх пры пахаванні чалавека ставілі яму посуд і клалі некаторыя прылады працы і быту. Ва ўжытку суседзяў бытаваў аналагічны інвентар працы. Бачачы падабенства, даследчык не мог не заўважыць і пэўнай розніцы. Гэта былі самастойныя этнасы [2, с. 20].

Вялікая роля ў вывучэнні гісторыі і культуры беларускіх зямель належыць старэйшаму з братоў К. П. Тышкевічу. Сярод яго шматлікіх даследаванняў гістарычных і культурных артэфактаў асобнае месца займае арганізаваная ім краязнаўча-археалагічная, фальклорная і этнаграфічная экспедыцыя па р. Вілія. Як справядліва сцвярджаюць даследчыкі, экспедыцыя доўга і скрупулёзна рыхтавалася і прадстаўляла сабой вельмі значны, грандыёзны для свайго часу праект. Для яе ажыццяўлення за ўласны кошт К. Тышкевічам была пабудавана цэлая флатылія з пяці суднаў. Яна пачалася 5 чэрвеня 1857 г. ад вёскі Каменка і працягвалася тры месяцы. Вілія, як пісаў Тышкевіч, выцякаючы з Мінскай губерні ад вытокаў сваіх да зліцця з Нёманам, працякае сем паветаў, адрозных між сабой прыродай, ландшафтам, урадлівасцю, заможнасцю; акрамя таго і разуменнямі, варункамі жыцця – і ўсё гэта вельмі выразна адбілася ў народнай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі экспедыцыі ляглі ў аснову фундаментальнай кнігі «Вілія і яе берагі», якую аўтар завяршыў у 1858 г. Праўда, выдана яна ўжо пасля смерці аўтара ў 1871 г. у г. Дрэздэне.

У час экспедыцыі К. Тышкевіч пабываў (і занатаваў звесткі аб іх) у 295 вёсках, мястэчках і гарадах. На ўсім працягу экспедыцыі К. Тышкевіч і яго каманда (грабцы, абслугоўваючы персанал і іншыя людзі, у тым ліку землямер і мастак; своеасаблівым правадніком экспедыцыі быў 70-гадовы Васіль Буслаўскі-Сапежка, які выдатна ведаў раку, суседнія населеныя пункты, засценкі, урочышчы, узгоркі і нават вялікія камяні) збіралі паданні, легенды, песні, праводзілі раскопкі, былі апісаны найбольш цікавыя археалагічныя помнікі. Значную цікавасць у К. Тышкевіча вызывалі помнікі архітэктуры: замкі, цэрквы, касцёлы.

К. Тышкевіч паклаў пачатак вывучэнню старажытных гарадоў на беларускіх землях – Лагойска, Заслаўя, Астрашыцкага гарадка; стварыў першыя тапаграфічныя планы гарадзішчаў.

Асаблівую ўвагу К. Тышкевіч надаваў вывучэнню фальклору, даследаванне якога стварае панараму духоўнага жыцця народа, у прыватнасці народнай песні. На берагах Віліі ім сабрана сто народных песень, у тым ліку на тэрыторыі цяперашняга Вілейскага раёна запісана іх каля дваццаці [1, с. 43]. У манаграфіі маецца асобны раздел «Пра песню гмінную». Аўтар падкрэслівае, што народная песня мае вялікае значэнне ў жыцці народа: спявае селянін, ідучы за плугам, спявае і вясковая дзяўчына ў час жніва, спяваюць і падлеткі на начлезе, спяваюць дружкі ў час вяселля і традыцыйных свят і абрадаў, спяваюць і дзяўчынкі, калі пасвяць свіней, спяваюць і жабракі, ідучы па дарозе, – словам, спяваюць усе, бо песня дапамагае ў розных жыццёвых абставінах. К. Тышкевіч параўноўвае песню з народнай літаратурай, як, у сваю чаргу, паданні і легенды некалі сталі першымі гістарычнымі творамі.

Разважае К. Тышкевіч і наконт таго, што збіраць народныя песні і паданні патрэбна было значна раней. Калі б грунтоўным зборам фальклору заняліся хаця б у XVI ст., то, па сцвярджэнні даследчыка, «...ад таго часу мы мелі б багаты зборнік народных песень, у якім, як у люстэрку, можна было б убачыць у цэласнасці і паўнаце праўдзівыя крыніцы тагачаснага жыцця народа, яго тайны, смутак і шчасце» [3, с. 149]. Тут жа аўтар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падае і гістарыяграфію па вывучэнні фальклорнай спадчыны народа, што таксама з’яўляецца каштоўным матэрыялам для даследчыкаў.

«Спявае грамада ў дні вяселля, спявае ў дні жалобы, спявае, бо мае патрэбу выказаць як-небудзь свае невымоўныя пачуцці, няспраўджаныя надзеі, неажыццяўлёныя жаданні…» [3, с. 143].

Успрыманне беларускай песні адрозніваецца ад песень іншых народаў. «У нас жа зусім іншыя параўнанні ў песнях маем. Белы лебедзь, смарагдавы колер павы багацце і веліч звыкла адлюстроўваюць. Сокал ёсць сімвал страху і сілы; зязюлька – сімвал сціпласці. Ружа і каліна сталі звыклым параўнаннем хараства дзяўчыны. Каралевіч з песні, які едзе за моры і рэкі па прыгажуню-дзяўчыну; ложкі і сталы цісавыя, вараны конь, шоўк, саета, замш, собалі і золата чырвонае заўсёды азначаюць багацце панскае. Гэтак жа і спеў салавейкі выкарыстоўваецца для паказу роскашы [3, с. 144–145].

Абодва браты шмат і паспяхова працавалі над разгадкай таямніц помнікаў старажытнага краю, у гэтым іх вялікая заслуга на ніве беларускай культуры і навукі. Яны па сутнасці заклалі фундамент археалагічных даследаванняў фалькларыстыкі, этнаграфіі і краязнаўства на Беларусі. Вынікі іх даследаванняў публікаваліся на розных мовах у Мінску, Вільні, Пецярбургу, Варшаве, Кракаве, Берліне, Дрэздэне і не страцілі актуальнасці і каштоўнасці ў наш час. Абодва яны прадстаўляюць сабой знакамітых асоб беларускай зямлі, якімі ганарацца нашчадкі.

1. *Ганчар, С. М.* Фальклорная спадчына Вілейшчыны ў даследаваннях К. Тышкевіча / С. М. Ганчар // Трэція Тышкевічскія чытанні (г. Вілейка, 24 лістапада 2010 г.) : матэрыялы чытанняў / рэд. кал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 92 с.

2. *Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі, І. Г. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с.

3. *Tyszkiewicz, K.* Wiliya i jej brzegi / K. Tyszkiewicz. – Vilnius. – 208 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ